# ЗАЛОГ ПОСПЕХУ

Народны кантроль — адна з вялікіх сацыяльных заваёў працоўных нашай краіны. Гэта якасна новы тып сацыяльнага кантролю, арганічна прысутны толькі сацыялістычнаму грамадству. Прыцягненне шырокіх мас працоўных да работы народнага кантролю з'яўляецца адной з найбольш шырокіх і даступных форм далучэння іх да кіравання усімі справамі дзяржавы і грамадства. Яно дае магчымасць набыць практычныя навыкі арганізатарскай работы, што дазваляе не толькі расшыраць і паглыбляць сацыялістычную дэмакратыю, але і акумуліраваць народную ініцыятыву і вопыт, ставіць іх на службу будаўніцтву камунізма.

У. І. Ленін неаднаразова падкрэсліваў думку аб тым, што майстэрства кіравання набываецца шляхам сістэматычнай настойлівай вучобы і практычнага ўдзелу ў кіраванні. Кантроль патрабуе ад кантралёраў вялікіх і даволі рознабаковых ведаў, якія неабходна сістэматычна папаўняць, расшыраць, паглыбляць.

Агульнавядома, што важна рабіць не толькі праверкі, але не менш важна праводзіць іх умела. У кожным канкрэтным выпадку трэба знайсці найбольш мэтазгодны падыход, каб глыбока і ўсебакова праверыць фактычнае становішча спраў. Эфектыўнасць кантролю ў значнай ступені залежыць ад таго, наколькі правільна і канкрэтна вызначаны меры па ліквідацыі выяўленых недахопаў, па іх папярэджанню ў будучым. Усё гэта патрабуе пэўных ведаў, умення.

У сакавіку ва універсітэце, як і ў іншых арганізацыях нашай рэспублікі, прайшлі справаздачна-выбарныя сходы па народнаму кантролю. У групы і пасты выбрана многа новых членаў, якія яшчэ не ўзброены неабходнымі ведамі. З мэтай лепшай падрыхтоўкі ветэранаў і навічкоў універсітэцкая група народнага кантролю намеціла план вучобы. Ёю будуць ахоплены члены універсітэцкай і факультэцкіх груп народнага кантролю, камсамольскія «пражэктарысты» і грамадскія кантралёры прафсаюзных арганізацый універсітэта.

Першыя заняткі адбудуцца 15 красавіка ў 17 гадзін. Перад народнымі кантралёрамі выступяць намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. І. Красоўскі і загадчык аддзела навукі і культуры камітэта народнага кантролю БССР О. А. Здравенін, якія раскажуць кантралёрам аб тых задачах, якія вырашаюць у нашы дні вышэйшыя навучальныя ўстановы рэспублікі, а таксама аб формах і метадах работы кантралёраў вышэйшай школы.

**Я. ТАГУНОЎ,**
**старшыня групы НК.**

# НА ПРЫКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА ЖЫЦЦЯ

Нядаўна я прачытала ў газеце «Правда» ў артыкуле народнага артыста СССР Б. Петкера такія словы:

«Калі меркаваць па узросту, дык Ленін пражыў нядоўгае жыццё — усяго 54 гады. Але як не падыходзіць менавіта да яго жыцця гэтае азначэнне «нядоўгае»: колькі зроблена ім для чалавецтва! Гэта значыць, што максімальна насычаным была кожная секунда яго існавання — іншага спосабу пераўтварыць кароткае жыццё ў бясконцае пакуль што яшчэ няма».

І як сказаў паэт У. У. Маякоўскі:

«Коротко
и до последних мгновений
нам
известна
жизнь Ульянова,
Но долгую жизнь
товарища Ленина
надо писать
и описывать заново».

Таму колькі б ні вывучалі мы жыццё Уладзіміра Ільіча, дзень за днём і гадзіну за гадзінай, — заўсёды нам будзе здавацца, што мы адкрываем усё новыя і новыя старонкі.

Перад намі, выкладчыкамі кафедры рускай мовы падрыхтоўчага факультэта, стаіць асабліва важная і адказная задача — пазнаёміць замежных студэнтаў з жыццём і дзейнасцю У. І. Леніна. Таму, пачынаючы з мінулага навучальнага года, уся наша работа вядзецца пад дэвізам дастойнай сустрэчы 100-годдзя з дня нараджэння Ільіча. Цяпер значнае месца ў працэсе навучання займаюць тэксты, малюнкі, дыяфільмы, альбомы, кінафільмы, экскурсіі, кнігі і іншыя матэрыялы аб Леніне.

Калектыў працуе зладжана і дружна. Строга, не парушаючы асноўнай сістэмы навучання студэнтаў-іншаземцаў рускай мове, выкладчыкі на разнастайных матэрыялах раскрываюць перад студэнтамі цудоўныя старонкі гісторыі, якія апавядаюць пра У. І. Леніна— чалавека і правадыра. І гледзячы, з якой зацікаўленасцю вывучаюць студэнты ленінскія матэрыялы, у памяці зноў ажываюць словы Маякоўскага:

«Да будь я
и негром
преклонных годов,
И то
без унынья и лени
я русский бы
выучил
только за то,
что им
разговаривал Ленин».

Работа ў групах па матэрыялах аб Леніне праводзіцца сістэматычна, з улікам паслядоўнага вывучэння граматыкі. У першым семестры выкарыстоўваліся невялікія па аб'ёму і даступныя па лексіцы тэксты. У гэты час закладваецца фанетычная і лексіка-граматычная база мовы. Тэксты ж з'яўляюцца цудоўным матэрыялам для развіцця навыкаў вуснай і пісьмовай мовы студэнтаў. Адначасова яны знаёмяць іншаземцаў з рэвалюцыйным мінулым нашай Радзімы.

Праводзячы гутаркі аб падрыхтоўцы савецкага народа да сустрэчы 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, выкладчыкі выкарыстоўвалі дыяфільм «У. І. Ленін», карціны, такія, як «Весткі з вёскі», «Выступление Ленина на III з'ездзе камсамола», «Ленін на трыбуне» і г. д.

Для студэнтаў былі арганізаваны экскурсіі ў СШ № 69, дзе наладжана багатая ленінская выстаўка, у дом-музей І з'езда РСДРП. У Доме дружбы іншаземцы глядзелі фільмы аб Леніне (дакументальныя і мастацкія). На факультэце чытаюцца лекцыі «Ленін і народная асвета ў СССР»; «Ленін—геніяльны прадаўжальнік вучэння К. Маркса і Ф. Энгельса», «Ленінізм — новы этап у развіцці марксізма» і іншыя.

Ва ўсёй сваёй шматграннай рабоце выкладчыкі кафедры карыстаюцца дапамогай і паслугамі супрацоўнікаў бібліятэкі, кабінета рускай мовы і фанетычнай лабараторыі.

Зараз, у другім семестры, працягваецца знаёмства студэнтаў з жыццём і дзейнасцю У. І. Леніна. Цяпер мы выкарыстоўваем шмат новых матэрыялаў: успаміны аб У. І. Леніне, біяграфічныя матэрыялы, артыкулы і ілюстрацыі з перыядычнага друку, фільмы, карціны савецкіх мастакоў аб У. І. Леніне.

Студэнты вучаць на памяць вершы і невялікія расказы аб У. І. Леніне. У групах праводзяцца канферэнцыі і ленінскія семінары, на якіх студэнты выступаюць з дакладамі.

Зараз разгорнута падрыхтоўка да вечара-канцэрта на рускай мове, прысвечанага 100-годдзю з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча.

Завяршаючым момантам з'явіцца конкурсныя сачыненні аб жыцці і дзейнасці правадыра. Няма сумнення ў тым, што такая работа прынясе добры плён.

**Л. МІЦКЕВІЧ,**
**ст. выкладчык кафедры рускай мовы падрыхтоўчага факультэта.**

*КАМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ*

# І АБАВЯЗАК, І ПАТРЭБНАСЦЬ

Быў вечар, калі я першы раз заглянула па нейкай справе ў камітэт камсамола фізфака. Мяне крыху здзівіла ажыўленне, якое панавала там. Аказваецца, студэнты часта тут збіраюцца, каб пагаварыць «аб усім». У адным кутку абмяркоўваўся камсамольскі сход, прадстаячая паездка ў Хатынь. Раіліся, дзе дастаць машыны. Хтосьці друкаваў на старой машынцы. Лёня Бураў у воблаку тытунёвага дыму рабіў эскізы новага значка для фізікаў. І вось ужо ў які раз незадаволена разглядвае іх і звяртаецца да акружаючых з просьбай «падкінуць ідэю».

А потым я бліжэй пазнаёмілася з рабятамі і зразумела, што работа ў камсамоле для іх не проста абавязак, а патрэбнасць. І, як уся-кая іншая работа, яна патрабуе шмат часу, сіл. І не толькі гэтага. Патрэбна мець арганізатарскія здольнасці, уменне аператыўна выконваць задуманае, працаваць з людзьмі. Зараз можна уявіць, ці лёгка 20 рабятам кіраваць камсамольскімі справамі двухтысячнага калектыву. Не толькі кіраваць, але дабівацца, каб як мага больш камсамольцаў прымала удзел у гэтай рабоце. Тым больш, што вучоба патрабуе шмат часу. Кожны з членаў камітэта, апрача работы ў сваім сектары, павінен сачыць за жыццём камсамольцаў усяго патока.

У камітэце пануе сяброўская атмасфера. Камсамольцы заўсёды дапамагаюць адзін другому выконваць даручаныя справы, а калі дапушчан промах, не пакінуць гэта так, сумесна наладзяць справы. Тут добразычліва адносяцца да тых, хто сам праяўляе ініцыятыву. І моладзь збіраецца ў камітэт, далучаецца да грамадскага жыцця. Асабліва гэта стала прыкметна пасля таго, як сакратаром быў выбран Пётр Кухарчык, чарнявы, са шчырым поглядам, заўсёды стрыманы і уважлівы юнак. Вялікім аўтарытэтам сярод студэнтаў карыстаюцца таксама Анатоль Мінько і Георгій Пучкоў. Ужо адно тое, што Анатоль з'яўляецца ленінскім стыпендыятам, не патрабуе тлумачэння яго адносін да вучобы і камсамольскай работы. А Жора кіруе выпускам факультэцкай газеты «За навуку!», якая займае трэцяе месца ва універсітэце. «Кумір моладзі, — жартаўліва сказаў аб ім Пётр Кухарчык, а затым патушыў усмешку і дадаў сур'ёзна: — Шчыры, удумлівы чалавек, выдатны таварыш.

Ірына Аляксандрава і Уладзімір Баклыкаў займаюцца шэфскай работай. Дзякуючы іх стараннію на факультэце створаны агітбрыгады, якія выязджаюць з канцэртамі і лекцыямі. Сельскім школьнікам перададзена звыш тысячы кніг, сярод якіх многа дапаможнікаў, падручнікаў. Нядаўна быў праведзен дзень адкрытых дзвярэй, і школьнікі мелі магчымасць пазнаёміцца з жыццём факультэта, пабываць на кафедрах, у лабараторыях.

Вялікая ўвага камітэта камсамола была звернута на правядзенне Ленінскага заліку. Усе члены камітэта ўваходзілі ў склад камісій. У многіх групах атрымалася сур'ёзная, шчырая размова —у рабят першага курса 12-й групы, чацвёртага курса 2-й групы радыёфізікаў. А вось у 13-й групе чацвёртага курса залік быў праведзен толькі фармальна.

Гэта, безумоўна, непрыемны выпадак.

Члены камітэта збіраюцца кожны тыдзень, а часам і некалькі разоў у тыдзень. Зараз асабліва адчуваюцца згуртаванасць камсамольцаў, сур'ёзныя адносіны да грамадскай работы. Важакі камсамольцаў факультэта дабіваюцца, каб бюро патокаў былі больш самастойныя, каб камітэту не даводзілася дубліраваць работу бюро.

Кожны дзень набліжае нас да знамянальнай даты— 100-гадовага юбілею У. І. Леніна. Камсамольцы фізічнага факультэта лічаць сваім абавязкам паўсядзённымі справамі апраўдаць ганаровае званне члена Ленінскага Саюза Моладзі, свята выконваць запаветы правадыра.

**Н. САЛУК.**

# ЗАЛІК АТРЫМАН

З хваляваннем рыхтаваліся да Ленінскага заліку студэнты 7-й групы II курса хімічнага факультэта.

Сход, прысвечаны заліку, адкрывае камсорг групы Люба Катуніна. Яна расказвае пра сваіх дзяўчат, пра іх клопаты і надзеі, няўдачы і радасці, з трывогай гаворыць аб тым, што абавязацельствы здаць сесію без дрэнных адзнак не выканалі. Перад Любай на стале ляжаць характарыстыкі тых, хто сёння трымае экзамен на вернасць справе Леніна.

— Ярмолава Таня.

Да стала імкліва падыходзіць высокая светлавалосая дзяўчына. Хвалюецца. Што скажуць пра яе таварышы?

— Старанная, настойлівая, добры таварыш, староста групы, заўсёды аб'ектыўная.

Характарыстыка прачытана. На нейкі момант у аўдыторыі усталявалася цішыня. А потым...

— Таня добры таварыш, усім дапамагае, — устае з месца Валя Дземідовіч.

— Захапляюся Таняй як старастай.

— Ёй можна даверыцца, як маці.

Залік у Тані прынят. Прагаласавалі усе.

Адна за другой падыходзяць да стала дзяўчаты.

Шмат добрых слоў было сказана пра Валю Дземідовіч, Любу Катуніну, Соф'ю Сцеранцац, Валю Чумакову, Надзю Бельскую.

Гаварылі на сходзе многа. І не толькі пра добрае. Шмат папрокаў давялося выслухаць Ірыне Буковіч і Ларысе Дзеравянка. Вучацца дзяўчаты нядрэнна і ў грамадскай рабоце удзельнічаюць, але вось з групай дружыць не умеюць. Менавіта тут, на заліку, выказалі ім аднакурсніцы усё, што думалі. І гэта прагучала не як прыгавор, а як парада быць заўсёды разам з таварышамі.

Ужо амаль дзве гадзіны ішоў залік, а спрэчкі не сціхалі. Добрая, вялікая размова ішла ў групе. І, як бы падводзячы вынікі, куратар Г. М. Булацкая сказала: «Сённяшні залік толькі пачатак. Вы будзеце трымаць яго усё жыццё. Зрабіце сваім дэвізам словы Ільіча: «Вучыцца, вучыцца і вучыцца». Будзьце заўсёды такімі ж непасрэднымі, дружнымі, няўрымслівымі».

**А. ЛАМЕКА,**
**Л. ПЕРАСЫПКІНА,**
**студэнткі журфака.**



*На I курсе матэматычнага факультэта ідуць чарговыя заняткі па чарчэнню. На пярэднім плане — студэнтка з В'етнама Фам Тхі Д'ем.*
*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*



## Да 50-годдзя універсітэта



# ПЕРШЫЯ СТУДЭНТЫ БДУ

*Савецкая улада шырока раскрыла дзверы Беларускага дзяржаунага універсітэта перад рабоча-сялянскай працоунай моладдзю. З розных канцоу Беларусі па камандзіроуках партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый прыйшлі ва універсітэт прагныя да ведау юнакі і дзяучаты — будучая беларуская савецкая інтэлігенцыя.*

*Студэнты першага набору выйшлі са сцен універсітэта у 1925 годзе высокакваліфікаванымі спецыялістамі — педагогамі, юрыстамі, эканамістамі, медыкамі. Працуючы на розных участках народнагаспадарчага і культурнага будауніцтва рэспублікі, яны заусёды і усюды высока трымалі гонар роднага універсітэта.*

*Многія са студэнтау першага выпуску і цяпер працуюць на карысць сацыялістычнай Радзімы. Сярод іх — Іван Емяльянавіч Лакін—рэктар Мінскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага, Дзмітрый Іванавіч Серко—вучоны сакратар аддзялення грамадскіх навук АН БССР.*

*Некаторыя са студэнтау першага выпуску пайшлі на заслужаны адпачынак, але не спынілі творчай дзейнасці. Так, пенсіянеры—вядомы беларускі бібліёграф Юлія Іосіфаўна Бібіла і былы загадчык беларускага аддзела Дзяржаунай бібліятэкі імя У. І. Леніна Адам Антонавіч Сакольчык у мінулым годзе апублікавалі «Бібліяграфію па гісторыі Беларусі» — працу вялікай навуковай каштоунасці.*

*Напярэдадні 50-годдзя універсітэта жадаем былым студэнтам першага набору і першага выпуску добрага здароуя, доўгіх год жыцця і творчых поспехау!*

*Е. АБЕЦЭДАРСКАЯ.*

**НА ЗДЫМКАХ (злева направа): І. Е. ЛАКІН, Ю. І. БІБІЛА, А. А. САКОЛЬЧЫК.**
**Здымкі публікуюцца упершыню.**

# РАЗМОВА З ГІСТОРЫЯЙ

Да 50-годдзя БДУ члены літаратуразнаучага гуртка філалагічнага факультэта вырашылі стварыць своеасаблівы летапіс літаратурнага жыцця універсітэта за пяцьдзесят гадоу, даследаваць ролю нашай альма-матэр у станауленні і развіцці беларускай савецкай літаратуры.

Як вядома, у БДУ на пачатку 20-х гадоу выкладау Якуб Колас, з універсітэтам пэуным чынам быу звязан Янка Купала, тут набывалі неабходныя веды Кандрат Крапіва, Кузьма Чорны, Пятрусь Броука, Пятро Глебка, Паулюк Трус, Іван Мележ і многія іншыя.

На пасяджэннях літаратуразнаучага гуртка толькі сёлета былі заслуханы і абмеркаваны даклады В. Дарашкевіча «Якуб Колас і Белдзяржуніверсітэт», Г. Нямковіч «Кандрат Крапіва — студэнт універсітэта», Я. Хвалея «Літаратурнае жыццё ва універсітэце у пасляваенны час», Г. Каржанеускай «Літаратары на старонках універсітэцкага перыядычнага друку», П. Сімановіча «Літаратурнае аб'яднанне «Узлёт». В. Бабіч, Т. Пятровіч, М. Місючэнка, С. Палітыка вывучаюць літаратурны рух у БДУ у канцы 20-х — пачатку 30-х гадоу. Іх паведамленні, якія вызначаюцца навізной сабранага матэрыялу, таксама былі сустрэты з вялікай цікавасцю. Усяго ж у гуртку займаецца больш дваццаці чалавек. І у кожнага ёсць свая тэма, свая частка працы. Пачынаючы з гэтага нумара, мы намерваемся знаёміць чытачоу «Беларускага універсітэта» з нашымі пошукамі, з лепшымі даследаваннямі.

Гуртко‌уцы папрасілі вядомых пісьменнікау, работнікау культуры падзяліцца сваімі успамінамі пра гады навучання ва універсітэце, пра тагачасны літаратурны рух, універсітэцкіх выкладчыкау і г. д. Пачынаюць прыходзіць лісты-адказы. Сёння мы публікуем урывак з ліста вядомага беларускага пісьменніка, заслужанага артыста БССР Яугена Рамановіча.

**В. РАГОЙША,**
**кіраунік літаратуразнаучага гуртка, в. а. дацэнта.**

**ДАРАГІЯ СЯБРЫ! Ваша пісьмо выклікала у мяне жывыя успаміны аб самым цудоуным часе майго жыцця: маладосці, вучобе, свежых пачуццях і празе да спазнанняу і адкрыццяу.**

**Скончыушы мінскую школу другой ступені, я, па пуцёуцы Галоупалітасветы, ластупіу восенню 1921 года на гістарычна-лінгвістычнае аддзяленне факультэта грамадскіх навук [ФОН] і акуратна наведвау лекцыі, спярша у памяшканні былога Рэальнага вучылішча на Захар'еускай вуліцы, а пасля у былой прыватнай гімназіі Хайкіна.**

**З педагогау, якія нам выкладалі розныя дысцыпліны, запомніліся рэктар Пічэта, прафесары Перцау і Нікольскі. Нас, маладых хлопцау з рабочых ускраін Мінска, яны называлі «фонікамі» і зычліва стараліся перадаць нам свае веды.**

**Час быу цяжкі. Толькі што закончылася вайна з акупантамі Пілсудскага, Мінск жыу у страшэннай нястачы. На паёк атрымлівалі крыху чорнага хлеба з мякінай, салёнай рыбы, бульбы і зрэдку яблычнага лавідла. Апрануты былі абы-як, у перашытую старызну. Галоунае было не згаладаць і выжыць. Таму калі ва універсітэце пачалі нас крыху падкармліваць, выдаючы штодня міску гарачага «пансаку» [суп з пярлоукі] альбо прасянай кашы, то гэта было добра.**

**Мы таксама стараліся дапамагчы чым маглі універсітэту: хадзілі у вёску перакопваць бульбу альбо у лес рыхтаваць дровы, а пасля выгружалі іх з вагонау на дрывяны склад, які знаходзіуся каля Заходняга моста уздоуж чыгуначнага палатна.**

**Вучыліся заузята, з вялікай прагай да ведау. Бегалі у Пушкінскую бібліятэку на Крашчэнскай вуліцы альбо абменьваліся падручнікамі паміж сабою. Галоуным дапаможнікам былі запісаныя на абгортачнай паперы, якую рознымі спосабамі здабывалі у гандляроу, лекцыі.**

**Хоць часу на вучобу было малавата, але я працавау яшчэ і загадчыкам клуба беларускай рабочай моладзі — «Беларускай хаткі»: трэба было памагаць сям'і, але заняткі наведвау акуратна, бо клуб працавау толькі два дні на тыдзень— у суботу і нядзелю.**

**Ва універсітэце, акрамя вучобы, мы праводзілі досыць актыуную грамадскую работу, арганізоувалі вечары-канцэрты, дзе ставілі розныя аднаактоукі, пераважна палітычнага зместу—аб грамадзянскай вайне альбо антырэлігійныя ці вясёлыя вадэвілі, дэкламавалі вершы Купалы, Коласа, Багдановіча, Цёткі альбо класічныя рускія і папулярныя у той час лірычныя Ясеніна, сатырычныя Дзям'яна Беднага, сімвалічныя Блока і Бальманта, паэмы Ігара Северяніна і інш.**

**Любімым нашым заняткам было выходзіць на святочныя дэманстрацыі на вуліцы Мінска. Мы да іх рыхтаваліся, пісалі плакаты з рэвалюцыйнымі лозунгамі, рабілі карыкатуры на пузатых капіталістау і гора-ваяк інтэрвентау, на белагвардзейскіх генералау, папоу і г. д...**

# НА СЕМІНАРЫ У МАТЭМАТЫКАУ

Прынята лічыць, што студэнтау матэматычнага факультэта ад усіх іншых адрознівае сухаватая строгасць, нават афіцыйная яснасць і лаканічнасць думкі. Хацелася пераканацца, якія усё ж матэматыкі на самай справе, ці могуць яны захапляцца, мець свае погляды і перакананні, адстойваць іх і спрачацца. У раскладзе заняткау мой погляд спыніуся на семінары па дыялектычнаму матэрыялізму у 6-й групе ІІ курса матфака. Пачатак праз 10 мінут, роуна у 16-00.

«Пайду», — наспела рашэнне.

...Пасля пераклічкі выкладчык Георгій Васільевіч Рыбанау крыху задумауся, а потым выклікау:

— Патапава.

З месца паднялася невысокая, на першы погляд сур'ёзная дзяучына і нясмелым, крыху глухаватым голасам пачала расказваць пра катэгорыі якасці, колькасці і меры. Відаць, хвалявалася, нешта пачала блытаць. Выкладчык перапытау яе, папрасіу удакладніць адказы. Тады Ала Патапава пачала прыводзіць прыклады з жыцця, цвяроза, правільна.

Наступным адказвау в'етнамец Чан Ван Тганг. Шчыра прызнацца, я нават не чакау, што на рускай мове ён здолее расказаць пра сутнасць скачка, эвалюцыю і рэвалюцыю. Але памыліуся. Без прыкметных намаганняу Чан Ван Тганг давау азначэнні, упэунена тлумачыу розныя тэзісы.

Староста групы Таня Літвінка, якая выпадкова аказалася маёй суседкай па парце, паспела ахарактарызаваць групу, назваць лепшых студэнтау.

— Закон адзінства і барацьбы процілегласцей,— ставіць пытанне Георгій Васільевіч.

На апошняй парце хударлявы юнак з дробнымі рысамі твару падняу руку.

— Вася Бабіч,— прадстауляе мне яго староста групы, — выдатнік і, напэуна, самы здольны сярод нас.

Юнак адказвау упэунена і разважліва. Усё было правільна. Толькі словы і выразы нейкія кніжныя, сухія.

«Ага, вось і пацвярджаецца, вось паказваюць свой сапрауддны твар матэматыкі»,— мільганула думка.

І раптам пачаушае усталёувацца меркаванне у пух і прах разбіу Міхаіл Фядзеня, таксама выдатнік.

Горача і страсна, пераканана і дэталёва пачау расказваць пра адноснасць адзінства і абсалютнасць барацьбы процілегласцей, пра развіццё супярэчнасцей. Выказаныя палажэнні падмацоувае прыкладамі з творау Энгельса і Леніна, робіць філасофскі аналіз некаторых матэматычных законау.

Стараецца вытрымаць тон таварыша і камсорг групы Лора Бандарэнка. Яна тлумачыць асноуныя і неасноуныя, галоуныя і негалоуныя супярэчнасці. Адчуваецца, што дзяучына не толькі з кнігі набыла веды, а спасылаецца на свой вопыт, веданне праяуленняу жыцця. Прыкметна яе палітычная адукаванасць, неблагая эрудыцыя.

Пасля адказу в'етнамца Чан Ван Тганга аб тыпах супярэчнасцей у развіцці грамадства выкладчык задае некалькі пытанняу, якія патрабуюць творчага падыходу, самастойнасці.

— Як, на вашу думку, што будзе асноунай супярэчнасцю пры камуністычным грамадстве?

Адны называюць прадукцыйныя сілы і вытворчыя адносіны, другія — сістэмы з розным грамадскім ладам

— Прырода і чалавек!— знойдзен нарэшце правільны адказ.

— А ці можна назваць антаганістычнымі супярэчнасці у прыродзе паміж драпежнікамі і недрапежнікамі, напрыклад, паміж ваукам і зайцам? — ставіцца чарговае пытанне.

І зноу падымаюцца рукі. Будучыя матэматыкі развіваюць сваю логіку, даказваюць, спрачаюцца...

Л. ПЕТЭРСОН.

*АГЛЯД НАСЦЕННАГА ДРУКУ*

# НАСЦЕНГАЗЕЦЕ «ЖУРНАЛІСТ»— СВАЁ АБЛІЧЧА

Насценгазета факультэта журналістыкі... Вось дзе, падумаеце вы, вострацца пер'і будучых газетчыкау, старанна шліфуецца кожны радок, прадумваецца кожнае слова, вось дзе усё робіцца легка, з прафесіянальным азартам.

Хацелася б так думаць і нам. Але вось мы пазнаёміліся з «Журналістам»...

Рэдкалегію павінны былі скласці 16 рабят, выбраных камсамольцамі факультэта на справаздачна-выбарным сходзе.

Павінны былі, але...

— Газету, па сутнасці, выпускаюць чацвёра «стойкіх» — Віктар Саханкоу, Наташа Лось, Валодзя Трусау і я, — гаворыць рэдактар насценгазеты Міша Каломенскі.

Пачакайце, чаму толькі чацвёра? Дзе ж астатнія? Знайсці і распытаць іх саміх — справа нялёгкая. На гэтае пытанне нічога канкрэтнага не могуць адказаць і у камітэце камсамола. А кантраляваць жа выкананне камсамольскіх даручэнняу—яго прамы абавязак.

Маучаць і самі камсамольцы, якія падымалі рукі на тым сходзе і якія цяпер абменьваюцца не вельмі прыемнымі каментарыямі, стоячы каля насценгазеты. Ім бы запытаць у тых 16-ці, чаму дрэнна працуюць?

Заслугоувае сур'ёзнага папроку і сам рэдактар. За разлад у камандзе адказвае капітан. І нам здаецца, быу бы Міша Каломенскі у самым пачатку больш патрабавальны і актыуны, усё магло быць інакш.

І вось над нумарам «пацеюць» чатыры чалавекі: пішуць, малююць, клеяць. Дзякуй першакурснікам — дапамаглі аформіць апошні нумар: некаторыя члены рэдкалегіі з-за хваробы не маглі працаваць.

Гэта акалічнасць толькі чуць змякчае ацэнку газеты, вывешанай да 23 лютага. Бляклыя здымкі, малазмястоуныя заметкі; непрадуманая макеціроука — вось што ёй прысутна. Яуна «выратавальнымі» для нумара служаць матэрыялы Р. В. Булацкага і вершы Г. З. Бегуна.

Пастаянныя рубрыкі, аб якіх расказау нам Міша Каломенскі, у гэтым нумары не былі знойдзены — ні ленінскай, ні інфармацыйнай, ні спартыунай. Жыццё факультэта закранута у двух матэрыялах — Г. Плігаукі і Л. Петэрсона.

Далёка ад дасканаласці і афармленне нумара. Своеасабліва выканана запаведзь рэдактара—«у газеце не павінна быць белых плям» — «белыя плямы» проста сталі жоутымі, сінімі, чырвонымі: матэрыялу ж не хапала.

А у першым жа нумары «Журналіста» гэтага года ёсць што пачытаць, паглядзець. Тут вершы У. Трусава, В. Аучарэнкі, В. Шырко. Нядрэнныя матэрыялы Я. Халява і Л. Екеля аб летняй практыцы і сельскагаспадарчых работах. Добры фотарэпартаж «Чытаючы Леніна» напісау А. Кудрауцау. Аб прыездзе да студэнтау гасцей — журналістау А. Аграноускага і С. Кандрашова і удзельнікау міжнароднага фестывалю маладзёжнай камуністычнай песні — расказваюць здымкі Сашы Ласмінскага. Не забыта і спартыунае жыццё: А. Трызна з гумарам піша аб футбольнай камандзе журфака.

Змакеціраван нумар кампактна, строга, прыгожа.

Але і тут мы не знайшлі сур'ёзных аналітычных матэрыялау, якія закранаюць праблемы факультэта. Горш за усё — бяззубасць, нейтральнасць, абыякавасць газеты да недахопау. А можа, проста аб іх не ведаюць: сувязь газеты з курсамі вельмі слабая. Пастаянных карэспандэнтау тут «Журналіст» не мае.

Неабходна закрануць пытанне і аб курсавых насценных газетах. У мінулым годзе кожны курс «пестavау» сваю насценгазету. Цяпер жа усе, акрамя першакурснікау, дружна адмовіліся ад сваіх «дзяцей». Насценгазетная «бясплоднасць» курсау не замарудзіла адбіцца і на агульнафакультэцкім органе...

Сапрауды дзіунае і недарэчнае становішча на факультэце, бо насценгазеты папулярны ва усіх — ад школьнікау да рабочых. А студэнты - журналісты, якія маглі б выкарыстоуваць насценны друк і для пробы пяра, і для вырашэння унутраных праблем, якіх на журфаку нямала, і, нарэшце, для славесных спаборніцтвау, незразумела чаму яе ігнаруюць.

Застою думкі, здаецца, няма — спрачаюцца, выступаюць у рэспубліканскіх газетах. Адным словам, унутранае жыццё бурліць, а вось дзе пачытаць аб тым, хто чым жыве і каго што хвалюе? Свая газета, нам думаецца, намнога узбагаціла б жыццё групы, курса. Не сакрэт жа, што добрая газета згуртоувае, арганізоувае студэнтау, абуджае іх думку.

А можа нашы студэнты прыдумалі нейкую новую форму калектыунага друкаванага органа, а насценгазету аб'явілі непатрэбнай, аджыушай?

Па крайняй меры, нешта падобнае на апошняе выказвае рэдактар «Журналіста» Каломенскі. Ён лічыць, што трэба адмовіцца ад насценнай газеты і выпускаць газету друкаваную, як гэта робіцца у ЛДУ. Мы выказалі засцярогу, што яе у нас можа спасцігнуць лёс насценнай. Рэдактар пацісную плячыма...

Мы бачым адзіны рэальны выхад з такога становішча — арганізаваць разумную і моцную рэдкалегію, даць адчуць адказнасць кожнаму яе члену перад усім факультэтам. Відавочна, было б мэтазгодна скараціць размеры насценгазетнага ліста (яго даужыня цяпер 3 м. 60 см.), але павялічыць перыядычнасць. На кафедрах факультэта ёсць вопытныя, заслужаныя журналісты. Чаму б ім не падзяліцца сваім майстэрствам непасрэдна у рабоце над насценгазетным лістом.

Каб дапамагчы газеце набыць сваё ранейшае аблічча, нам здаецца, патрэбна самая актыуная дапамога з боку партыйнага бюро, камітэта камсамола факультэта.

Ю. ВЕЛЬТНЕР.




# ГАЛАСЫ РОДНАГА КРАЮ

Яшчэ у папярэднім зборніку «Лясныя сябры» Я. Зазека выступіу як сапраудны паэт прыроды. Гэта паэзія адчуваецца і у новым зборніку. Аутар раскрывае таямніцы лесу, апісвае звычкі звяроу і птушак. Я. Зазека — прызнаны даследчык беларускай прыроды. І уменне бачыць тое, што закрыта для другіх, з'яуляецца яго адметнай рысай. У гэтых адносінах звяртаюць на сябе увагу апавяданні «Гаспадар пушчы» і «Салауі». У першым аутар паказвае маленькі адрэзак з жыцця цароу пушчы — зубрау. Аб дзіуных жывёлінах мала што вядома, а пісьменнік здолеу знайсці і паказаць чытачу такое, чаго амаль ніхто не ведау — адносіны старэйшых жывёл да нованароджанага зубраняці. «...На невялічкай палянцы, у кустах, цесным колам стаялі зубры. Яны цягнуліся лысамі да маленькага зубраняці, і з ноздрау іх валіла пара. Нованароджаны быу мышастай масці, пушысты, у завітках і яшчэ нясмела стаяу на тонкіх ножках. Зубры дыхалі на малога, баючыся, каб ён не змёрз». Зубраня падрасло. Яно «было вельмі вясёлае, жвавае і любіла забауляцца з Пумам. Стары зубр стаць, як бурая скала, прыгнуушы магутную шыю, а малы упіраецца у яго шырокі лоб сваім вузенькім. Доуга дужаюцца. Калі малы заузята пачынае наступаць, Пум адыходзіць, нібы паддаецца. і нарэшце кідаецца науцёкі. Тады зубраня радасна бяжыць за ім, каб дагнаць». Толькі чалавек, вельмі зачараваны родным краем, можа так падрабязна апісваць паводзіны яго жыхароу, кожны раз знаходзячы усё новыя і новыя мастацкія сродкі.

Цікава напісаны апавяданні «Шпачок», «На рыбалцы», «Сонечны алень», замалёука «Старонкі восені». З замілаваннем апісвае аутар малюнкі восеньскага лесу, яго пахі, галасы, падслуханыя на досвітку. Мова апавяданняу простая, без прэтэнзіі на квяцістасць.

Творы Я. Зазекі аб прыродзе, аб лесе і яго жыхарах цікавыя не толькі дзецям, але і дарослым.

**В. ШЫХАНЦОЎ.**

# МАДЭЛЬЕРЫ ПРАПАНУЮЦЬ

**Наш карэспандэнт А. АЛЕКСАНДРОВІЧ пабывала у рэспубліканскім Доме мадэляу і папрасіла мастацтвазнауцу В. М. КАПУСЦІНСКУЮ расказаць аб напрамках у сучаснай маладзёжнаи модзе.**

Маладжавасць у сучаснай модзе — паняцце адноснае. Зараз мы будзем весці размову аб тых, хто бясспрэчна малады — аб студэнтах.

У маладзёжным, асабліва студэнцкім асяроддзі быць добра апранутым зусім не азначае мець боцікі за шалёную цану або пашыты у лепшага шауца касцюм.

Сучасная мода асабліва зручная для тых, хто сам любіць шыць, камбінаваць, выкарыстоуваць выпадковыя знаходкі, хто умее бачыць нешта новае і арыгінальнае у знаёмай ужо рэчы.

Стварыць своеасаблівы, цікавы стыль са стандартных дэталяу — вельмі захапляючая задача. Арыгінальная знаходка можа надаць зусім новы выгляд самай простай рэчы. Сучасны напрамак у модзе, які аднауляе прыгоства і чэрпае натхненне у рабочым і спартыуным стылях, ахвотна выкарыстоувае забауныя дэталі з моды 20-х гадоу (кепкі, шыйныя хусцінкі, шарфы), элементы каубойскага стылю, доугія штаны і, зразумела, кароткія спадніцы. Дарэчы, спадніцы цяпер у модзе клетчатыя, яркія, цікавых фасонау: са складкамі, гузікамі, паясамі і дэкаратыунай строчкай. Строчка упрыгожвае усе віды адзення. Добра падыходзяць маладым фасоны, якія паутараюць дэталі рабочага адзення. Папулярнымі з'яуляюцца касцюмы з кароткімі курткамі, штаны са строчкай, жылеты. Часта сустракаюцца засцёжкі-«маланкі», кішэні з клапанамі, шырокія паясы, абутак з шырокім рантам.

Надаюць асаблівую маляунічасць яркія паласатыя шарфы. Аднатоннае адзенне ажыуляюць стракатыя касынкі.

Галауныя уборы — глыбока нацягнутыя берэты, задорныя кепкі, дауно знаёмыя лётныя шлемы.

Асобае месца у сягонняшняй і у прыватнасці маладзёжнай модзе займае жылет. Ён можа прыдаць сучасны выгляд самаму стандартнаму адзенню. Менавіта пры пашыве жылета можна даць волю фантазіі: выбраць цікавую тканіну, упрыгожыць яе вышыукай, пацеркамі.

Цяпер шмат гавораць пра рэвалюцыю у мужчынскай модзе. Сенсацыю выклікалі яркія фарбы, узоры, якія дагэтуль лічыліся уласцівымі толькі жаночаму адзенню, кашулі з карункамі, упрыгожанні і г. д. Амаль зусім згубілася, знікла адна з важнейшых тэндэнцый сучаснай моды— імкненне аднавіць і прадаужаць класічны стыль у мужчынскім адзенні. Гэта паліто і касцюмы, якія большасць мужчын свету носіць незалежна ад узросту. Але і на адзенне у традыцыйным стылі аказала уздзеянне новая мода.

Сілуэт паліто стау больш прыталеным і даужэйшым. Больш, чым раней, выкарыстоуваюцца дэталі у іх самых розных варыянтах—кауняры, лацканы, кішэні, засцёжкі. Сустракаюцца класічныя лацканы з дзвюма праразнымі петлямі, так званыя афіцэрскія кауняры з нізкімі адагнутымі адваротамі, кауняры без лацканау, вялікія, спартыунага тыпу кауняры.

Побач з кішэнямі з лістачкай і клапанамі сустракаюцца вялікія накладныя. Нагрудныя кішэні звычайна робяць на паліто і куртках. Многа строчак. Найбольш распаусюджаныя тканіны — твід і тканіна у ёлачку, для паліто спартыунага тыпу — шкура. Асаблівасць тканіны і апрацоука дэталей надаюць паліто элегантны або спартыуны выгляд. Часцей за усё пераход ад аднаго стылю да другога малапрыкметны.

Даміріуе элегантна-дзелавы стыль. Побач з касцюмамі спартыунага тыпу і касцюмамі падкрэслена элегантнымі існуе многа варыянтау, якія аб'ядноуваюць элементы першых і другіх.

Дзелавітасць касцюма з бліскучай тканіны падкрэслена двайной дэкаратыунай строчкай і шырокімі лацканамі, элемент элегантнага касцюма — адстрочаны жылет.

Доугі пінжак — паупаліто з моднай тканіны у ёлачку мае спартыуны характар. Касцюм традыцыйнага пакрою шыюць у асноуным з тканіны з малюнкам — паласатай, клятчатай, у ёлачку і стракатых відау. Двухбортны клятчаты касцюм напамінае моду 30-х гадоу.





# НЕ РЫЗЫКУЙЦЕ ЖЫЦЦЁМ

Тралейбус, здаецца, быу яшчэ далекавата. Не хацелася спыняцца: у гэтым ёсць нейкі азарт і рызыка праскочыць ля самых колау машыны. І ён рынууся наперад... А вынік аказауся сумны. З цяжкімі траумамі і пераломамі студэнт тэхналагічнага інстытута Пётр Дзегцяроу быу дастаулен у бальніцу. І зусім трагічна закончылася такая рызыка для студэнта БДУ Е. Шаучука. За сваю неасцярожнасць юнак паплаціуся жыццём.

Цяжка вымераць глыбіню таго гора у сям'і, з якой аутадарожная аварыя ці здарэнне вырвалі любімага чалавека, або зрабілі яго калекам. Дарожныя аварыі наносяць велізарны матэрыяльны урон і дзяржаве.

А прычынай гэтага часцей за усё бывае адно — парушэнне устаноуленых правіл вулічнага руху як вадзіцелямі, так і пешаходамі. І грэбаваць гэтымі правіламі нельга. З павелічэннем аутамабільнага парку краіны, ростам ліку матацыклау, матаролерау і іншых транспартных сродкау, з ростам насельніцтва нашага горада адпаведна узрастае інтэнсіунасць руху на вуліцах і дарогах, а, значыць, узрастае і верагоднасць няшчасных выпадкау. Бяспечнасць, няуважлівасць пешаходау на вуліцы, нават самыя нязначныя адхіленні ад правіл руху прыводзяць да непажаданых вынікау — аварыі, наездау на людзей, перашкаджаюць рабоце транспарту.

Правілы руху патрэбна добра ведаць і строга іх выконваць. Памятайце: заманлівае жаданне выйграць хвіліну можа прывесці да страты жыцця.

**Н. АЛІСІЁНАК,**
**старшы дзяржаўтаінспектар АУС Кастрычніцкага райвыканкома.**

## СПОРТ

# ВЕРХ УЗЯЛІ ДУЖЭЙШЫЯ

**Барцы вольнага стылю старанна шліфавалі свае майстэрства на працягу вучэбнага года, а нядауна прадэманстравалі яго у першынстве горада сярод першаразраднікау. Першае месца на барцоускім дыване заняу студэнт Сокалау (хімфак), другое — Міхайлау (юрфак), трэцяе — Рудакоускі (гістфак).**

А 29 сакавіка у зале барацьбы БДУ было праведзена першынство універсітэта сярод навічкоу. У спаборніцтвах прынялі удзел 36 спартсменау. Іх трэнеру У. М. Летуну было прыемна паглядзець на вынікі сваей працы; большасць барцоу паказала добрую барацьбу, волю да перамогі, смеласць. Кожнаму з маладых хацелася перамагчы, але заусёды верх брау дужэйшы. Асабліва хочацца адзначыць студэнтау Садлуцкага, Літвінава, Мірзаханава, Бруцкага, Мятлу, якія у хуткім часе пры старанных трэніроуках могуць дасягнуць нядрэнных вынікау.

Чэмпіёнамі універсітэта сярод навічкоу сталі Левы і Грамыка (матфак), Бруцкі (фізфак), Мітраховіч (біяфак), Садлуцкі (фізфак).

**А. САЧАНКА,**
**студэнт.**



*ПЕРШАЕ КУПАННЕ.*
*Фотаэцюд А. АНТАНОВІЧ.*

### ПАПРАУКА

У дзесятым нумары газеты у артыкуле Е. Абецэдарскай «Свята беларускай культуры» дапушчана памылка. Перадапошні абзац трэба чытаць так: «30 кастрычніка 1921 г. адбылася універсітэцкая урачыстасць, на якой пасля уступнага слова рэктара прафесар І. М. Салауёу прачытау даклад «Задачы сучаснай навуковай педагогікі», а прафесар М. Б. Кроль—даклад «Мысленне і мова».

Рэдактар
**А. А. НІКОЛЕНКА.**

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоуны корпус, п. 106. Т 22-07-19. Друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Тыраж 2000 экз. Зак. 518. АТ 02175